1 ВЕРАСНЯ 2024
ІВАЦЭВІЧЫ

# XXXI ДЗЕНЬ БЕЛАРУСКАГА ПІСЬМЕНСТВА




ДЗЕНЬ БЕЛАРУСКАГА ПІСЬМЕНСТВА

**Праграма мерапрыемстваў Дня беларускага пісьменства**
**(горад Івацэвічы, Брэсцкая вобласць)**

**31 жніўня – 1 верасня – праца фестывалю кнігі і прэсы, прадстаўленага 4 асноўнымі тэматычнымі павільёнамі:**

– «Сучасная Беларусь» – тэматычная выстава, прысвечаная 30-годдзю беларускай дзяржаўнасці, Канстытуцыі Рэспублікі Беларусі і інстытуту прэзідэнцтва;

– «Беларусь памятае» – тэматычная выстава, прысвечаная 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў;

– «Зроблена ў Беларусі» – тэматычная выстава, прысвечаная Году якасці;

– «Слова пісьменніка» – інтэрактыўная пляцоўка, на якой пройдуць прэзентацыі, аўтограф-сесіі, творчыя сустрэчы з аўтарамі, членамі ГА «Саюз пісьменнікаў Беларусі».

**31 жніўня 2024 года:**

– **навукова-практычная канферэнцыя «Івацэвіцкія чытанні»**, падрыхтаваная Міністэрствам інфармацыі і Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі;

– **унікальная сустрэча** з народным пісьменнікам Беларусі Мікалаем Чаргінцом, народнай артысткай БССР Марыяй Захарэвіч і заслужаным дзеячам культуры БССР, народным артыстам Беларусі Эдуардам Ханком;

– **эксклюзіўны паказ** дакументальнага фільма «Загадана жыць», прысвечанага Аляксею Пятровічу Чарткову – камандзіру 122-га партызанскага атрада, які дзейнічаў у гады Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Беларусі;

– **урачыстая цырымонія ўскладання кветак** да помніка загінулым падчас Вялікай Айчыннай вайны;

– **ваенна-гістарычная рэканструкцыя**, прысвечаная партызанскаму руху Івацэвіцкага раёна;

– **адкрыццё арт-аб'екта «Дзеці лясной школы»**;

– **гала-канцэрт пераможцаў рэспубліканскага конкурсу юных чытальнікаў «Жывая класіка»**;

**– 20.00 – урачыстая цырымонія адкрыцця Дня беларускага пісьменства, у рамках якой узнагародзяць пераможцаў «Нацыянальнай літаратурнай прэміі».**

**1 верасня 2024 года:**

– 11.00 – **прэзентацыя** літаратурна-мастацкай імпрэзы Саюза пісьменнікаў Беларусі;

– 12.40 – **узнагароджанне журналістаў**, пераможцаў рэспубліканскага творчага конкурсу «Хвала рукам, што пахнуць хлебам»;

**– 14.00 – урачыстая цырымонія закрыцця свята, у рамках якой пройдзе перадача вымпела сталіцы Дня беларускага пісьменства ў 2025 годзе – гораду Ліда Гродзенскай вобласці.**